Belarus live

# Newsletter
11.12.2006

Эўразьвяз павінен добра разважыць пытаньне адмены гандлёвых прэфэрэнцыяў для Беларусі – лічыць Менск – бо ж у выніку эканамічных санкцыяў найперш пацерпяць звычайныя грамадзяне. Гэта адказ на рашэньне групы экспэртаў Эўразьвязу выключыць Беларусь з Генэральнае сыстэмы прэфэрэнцыяў. Беларусь у адказ на эканамічныя санкцыі можа паслабіць ахову межаў з Эўразьвязам – заяўляе беларускі парлямэнтар Мікалай Чаргінец.

На мінулым тыдні Эўрапейская Камісія прадставіла новы варыянт разьвіцьця суадносінаў з краінамі-суседкамі. Яшчэ раз было падкрэсьлена, што для поўнага ўдзелу ў праграмах эўрапейскае палітыкі добрасуседзтва Беларусь мусіць выканаць 12 умоваў, на якія не пагаджаецца афіцыйны Менск.

Між тым беларуская апазыцыя запрапанавала ўладам стварыць сумесную працоўную групу, каб абмеркаваць прапановы Эўразьвязу. Неабходная агульнанацыянальная дыскусія ў краіне, бо пасланьне Эўразьвязу скіраванае ня толькі да ўладаў, яно ж датычыць усіх грамадзянаў, – сьцьвярджае апазыцыя.

Адзін зь беларускіх апазыцыйных лідэраў Анатоль Лябедзька заклікае парлямэнтароў пачаць працэдуру імпічмэнту Аляксандра Лукашэнкі. Пасьля таго, як кіраўнік краіны публічна прызнаўся ў фальсыфікацыі вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў (сакавік 2006), Цэнтрвыбаркам ня мае падставаў займацца арганізацыяй выбарчай кампаніі ў мясцовыя органы ўлады (студзень 2007).

## АФІЦЫЙНА
- Беларусь адна з найменш карумпаваных краінаў
- Сустрэча кіраўнікоў МУС Расеі, Беларусі й Украіны

## ПАЛІТЫКА
- Чаргінец пагражае ЭЗ хворымі на СНІД і тэрарыстамі
- Улады Маладзечна перашкодзілі ў правядзеньні сустрэчы прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі з жыхарамі гораду

## АПАЗЫЦЫЯ
- Анатоль Лябедзька дамагаецца імпічмэнту Лукашэнкі
- Беларуская апазыцыя прапаноўвае ўладзе абмеркаваць прапановы Эўрапейскага Зьвязу

## ЭКАНОМІКА
- Эўразьвяз адменіць гандлёвыя ільготы для Беларусі
- Стабілізацыйны крэдыт ад Расеі
- Цана „Белтрансгазу” – 3,5 млрд даляраў

## ГРАМАДЗТВА
- Новыя польскія візы для беларусаў
- Хэльсынская Фэдэрацыя заклікае дапамагчы беларускім праваабаронцам
- Каталікі перамаглі чыноўнікаў

## КУЛЬТУРА
- Чарнобыль пачынаецца ў Познані
- „Наша Ніва” ў Магілёве й Бялынічах


Аляксандар Казулін

Ужо 50 дзён галадае Аляксандар Казулін. За гэты час экс-кандыдат у прэзыдэнты Беларусі схуднеў на 40 кіляграмаў. Сёньня стан здароўя апазыцыйнага палітыка крытычны. Фактычна гэта ўжо пытаньне жыцьця й сьмерці. Палітык заяўляе, што працягне галадоўку да моманту, пакуль ня будзе выкананая ягоная ўмова, зь якой ён пачынаў свой пратэст, – сытуацыю ў Беларусі павінна разгледзець Рада бясьпекі ААН.

Прыцягнуць увагу да дадзенай праблемы ўвесь час стараюцца апазыцыйныя дзеячы. У прыватнасьці Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) правяла масавую акцыю ў падтрымку свайго лідэра. У эстафэтнай галадоўцы ў Менску ўдзел узялі каля 30 асобаў.

Між тым адзін зь лідэраў беларускай апазыцыі Аляксандар Мілінкевіч вылучыў А. Казуліна на атрыманьне прэстыжнай міжнароднай прэміі Марціна Эналса.

6 дзён галадоўкі каталікоў у Горадні прымусілі ўлады зрабіць тое, на што ім не хапіла 10 гадоў. Урэшце ёсьць згода гарадзкіх уладаў на будову касьцёлу на месцы капліцы парафіі Маці Божай Вострабрамскай. ■

# АФІЦЫЙНА

## Беларусь адна з найменш карумпаваных краінаў

**Рэспубліка Беларусь зьяўляецца адной з найменш карумпаваных краінаў у сьвеце. Гэткую выснову можна зрабіць на падставе рэйтынгу праведзенага The Gallup Poll сярод 101 краіны – інфармуе Белта.**

Жыхары згаданых дзяржаваў адказвалі на два пытаньні, датычныя маштабу зьявы карупцыі ў асяродзьдзі ўлады й бізнэс-структурах краіны.

У рэйтынгу The Gallup Poll краіна можа атрымаць 100 балаў. „0” – азначае самы нізкі ўзровень карупцыі, а „101” – самы высокі. Згодна з гэтымі крытэрыямі найменш карумпаваныя краіны сьвету гэта: Фінляндыя – 12 балаў, Данія й Новая Зэляндыя – па 21 (дваццаць адным) балу, Сынгапур – 22, Саудаўская Арабія – 25, Вялікабрытанія, Нарвэгія й Швэйцарыя – па 36 балаў, Аўстралія -37, Швэцыя – 39, а ЗША – 59 балаў.

Сярод краінаў СНД найменш карумпаванай краінаў аказаўся Узбэкістан – 54 балы. Беларусь, якая атрымала 63 балы, апынулася на 26 месцы. Украіна й Расея ў рэйтынгу The Gallup Poll апынуліся на адным – 93 – месцы, атрымліваючы 90 на 100 магчымых балаў.

Найбольш карумпаванай краінай у ацэнцы The Gallup Poll зьяўляецца Летува, якая атрымала 94 балы.

## Сустрэча кіраўнікоў МУС Расеі, Беларусі й Украіны

**Міністры ўнутраных справаў Расеі, Беларусі й Украіны абмяркоўваюць у Менску пытаньні, зьвязаныя з трансмежнай злачыннасьцю ў сфэры эканомікі.**

Як паведаміла беларускае МУС, трохбаковай супрацы характэрная станоўчая дынаміка. Надалей актуальнымі пытаньнямі застаецца легалізацыя даходаў са злачыннай дзейнасьці, абарачэньне паліўна-змазачнымі матэрыяламі й пазьбяганьне платы падаткаў.

Кіраўнікі МУС Расеі, Беларусі й Украіны зоймуцца таксама магчымасьцямі абмену інфармацыяй, датычнай арганізаванай злачыннасьці й пытаньнем супрацьдзеяньня карупцыі сярод мытнікаў і памежнікаў – інформуе сайт „Белорусский Партизан”.

Нагадаем, што 7 сьнежня ў Менску павінна адбыцца сустрэча кіраўніка Міністэрства ўнутраных справаў Расеі з прэзыдэнтам Аляксандрам Лукашэнкам.

# ПАЛІТЫКА

## Чаргінец пагражае ЭЗ хворымі на СНІД і тэрарыстамі

Беларусь можа паслабіць ахову межаў з Эўразьвязам у выпадку адмены для краіны гандлёвых прэфэрэнцыяў, – заявіў старшыня камісіі Савету Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бясьпецы Мікалай Чаргінец падчас прэс-канфэрэнцыі ў панядзелак у Менску.

„Эўропа хваліць нас за добрыя межы, так можа нам варта частку сродкаў канфіскаваць з памежнай бясьпекі й накіраваць на пакрыцьце страт ад адмены прэфэрэнцый” – сказаў ён.

„На беларускіх межах па дарозе ў Эўразьвяз затрымоўваюць дзесяткі і сотні хворых на СНІД, падазраваных у тэрарызьме і стварэньні злачынных груп” – адзначыў М. Чаргінец. „Эўрапейскія выбаршчыкі не скажуць „дзякуй” сваім парлямэнтарам, калі Беларусь паслабіць свае межы” – сказаў ён і дадаў, што адмена прэфэрэнцыяў закране 44% беларускага экспарту.

У жніўні Эўрапейская камісія запатрабавала, каб за бліжэйшыя 8 месяцаў беларускія ўлады выканалі 12 рэкамендацыяў Міжнароднай арганізацыі працы датычных гарантыяў правоў незалежных прафсаюзаў. Па гэтай прычыне ЗША ўжо раней адмяніла прэфэрэнцыі для Менску, аднак гандлёвы абмен Беларусі са ЗША куды меншы ў параўнаньні з гандлем з Эўразьвязам.

## Улады Маладзечна перашкодзілі ў правядзеньні сустрэчы прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі з жыхарамі гораду

**Улады Маладзечна перашкодзілі ў правядзеньні сустрэчы прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі з жыхарамі гораду. Мерапрыемства праходзіла ў рамках праекту „Выбар для Беларусі” ў адной з кавярняў горада. Згаданы праект прымеркаваны да выбараў у мясцовыя органы ўлады, якія пройдуць 14 студзеня 2007 г. Мэта сустрэч – інфармаваньне грамадзян пра палітычныя, эканамічныя ды сацыяльныя праблемы беларускага грамадзтва.**

Як паведаміў агенцтву БелаПАН удзельнік мерапрыемства, чалец-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі праф. Іван Нікітчанка, на сустрэчы пасьпелі выступіць праваабаронца Алег Воўчак, былы сьпікер парлямэнту Мечыслаў Грыб, экс-старшыня Нацбанку Станіслаў Багданкевіч ды сам Нікітчанка. Але перад наступным выступоўцам нечакана ў зале паявіўся арганізатар сустрэчы і сказаў, што ўладальніцы кавярні пазванілі з гарвыканкама Маладзечна з загадам спыніць мерапрыемства. У іншым выпадку за справу возьмуцца праваахоўныя органы.

На сустрэчы ў Маладзечна ішла гаворка пра дзяржаўную палітыку ў галіне правоў чалавека, дзяржаўны лад краіны, фінансавую базу беларускай эканомікі і пра чарнобыльскія пагрозы.

Сустрэчы з жыхарамі розных гарадоў у рамках праекту „Выбар для Беларусі” будуць працягнуты ў 2007 годзе.

# АПАЗЫЦЫЯ

## Анатоль Лябедзька дамагаецца імпічмэнту Лукашэнкі

**Лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька мае намер зьвярнуцца да кожнага дэпутата Палаты прадстаўнікоў з прапановай пачаць працэдуру імпічмэнту прэзыдэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Партыя ў межах кампаніі "За свабоду" ініцыюе арганізацыю й ажыцьцяўленьне шэрагу акцый і дзеяньняў, мэтай якіх зьяўляецца правядзеньне ў Беларусі свабодных выбараў без фальсыфікацый.**

Акрамя прапановы аб імпічмэнце, АГП лічыць неабходным дабівацца адстаўкі ўсяго складу Цэнтрвыбаркаму, які адказваў за правядзеньне прэзыдэнцкай кампаніі. Лябедзька перакананы, што пасьля

прызнаньняў Лукашэнкі на прэс-канфэрэнцыі з украінскімі журналістамі ў фальсыфікацыі вынікаў прэзыдэнцкай кампаніі, ў чальцоў Цэнтрвыбаркаму няма падстаў займацца арганізацыяй выбарчай кампаніі ў мясцовыя саветы, якія заплянаваныя на 14-ага студзеня 2007.

## Аляксандр Мілінкевіч вылучыў А. Казуліна на атрыманьне прэстыжнай прэміі ў галіне правоў чалавека

**Лідэр аб'яднаных дэмакратычных сілаў Беларусі Аляксандр Мілінкевіч ініцыяваў вылучэньне Аляксандра Казуліна на прэстыжную прэмію Марціна Эналса, першага Генэральнага сакратара Amnesty International – інфармуе прэс-служба А. Мілінкевіча.**

Прэмія Марціна Эналса зьяўляецца адной з галоўных узнагародаў руху за правы чалавека. Яе ляўрэатамі становяцца людзі, якія зьяўляюцца "сымбалямі барацьбы за правы чалавека ў краінах, дзе абарона правоў чалавека й дэмакратыі прадстаўляе сабой небясьпечны від дзейнасьці".

„Мужнасьць і рашучасьць Аляксандра Казуліна ў барацьбе за свае правы выклікае захапленьне. Яго галадоўка сёньня зьяўляецца сымбалем імкненьня ўсіх беларусаў жыць у свабоднай дэмакратычнай краіне. Пра яе павінен ведаць увесь сьвет. Гэтая ўзнагарода, перш за ўсё, стане магутным міжнародным патрабаваньнем да рэжыму ў Беларусі – пачаць вызваленьне палітычных вязьняў” – сказаў Аляксандр Мілінкевіч.

Прэмія Марціна Эналса зьяўляецца ўнікальнай супольнай акцыяй адзінаццаці вядучых няўрадавых праваабарончых арганізацый сьвету. У склад журы Прэміі ўваходзяць прадстаўнікі Amnesty International, Human Rights Watch, Human Rights First, Міжнароднай фэдэрацыі правоў чалавека, Усясьветнай арганізацыі супраць катаваньняў, Front Line, Міжнароднай камісіі юрыстаў, German Diakonie, International Service for Human Rights, International Alert і арганізацыі "Сыстэмы інфармацыі й дакументацыі па правах чалавека" (HURIDOCS).

Былы кандыдат у прэзыдэнты, палітычны вязень Аляксандр Казулін аб’явіў галадоўку 20 кастрычніка, пратэстуючы такім чынам супраць „існуючага ў краіне беззаконьня”, а таксама каб прыцягнуць увагу Рады Бясьпекі ААН да сытуацыі ў Беларусі. Палітык галадае ўжо 48 дзён.

## Заклік А. Мілінкевіча

**Лідэр аб’яднаных дэмакратычных сілаў Беларусі Аляксандар Мілінкевіч зьвярнуўся з адкрытым лістом – заклікам да прэзыдэнтаў Расеі, ЗША й Францыі, а таксама да канцлера Нямеччыны „зрабіць усё магчымае, каб уратаваць жыцьцё Аляксандру Казуліну й вызваліць усіх палітычных вязьняў у Беларусі”.**

Аляксандр Казулін абяцае спыніць галадоўку ў тым выпадку, калі хаця б адна краіна "вялікай васьмёркі" заявіць аб намеры паставіць пытаньне аб сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі на разгляд Рады Бясьпекі ААН.

„Шаноўныя Спадары Прэзыдэнты й Спадарыня Канцлер!
Сёньня таксама й ад Вашай пазыцыі залежыць жыцьцё чалавека, які асьмеліўся супрацьстаяць дыктатарскаму рэжыму!(...) Таму заклікаю Вас зрабіць усё магчымае, каб уратаваць жыцьцё Аляксандра Казуліна й вызваліць палітвязьняў у Беларусі,” – чытаем у адкрытым звароце Аляксандра Мілінкевіча.

Былы кандыдат у прэзыдэнты Рэспублікі Беларусь Аляксандр Казулін, асуджаны на пяць з паловай гадоў турмы, пачаў бестэрміновую галадоўку пратэсту 20 кастрычніка 2006 года. За восем месяцаў зьняволеньня і 49 дзён галадоўкі Аляксандр Казулін пахудзеў на сорак кіляграмаў. Паводле мэдыкаў, жыцьцё А. Казуліна апынулася пад пагрозай – інфармуе прэс-служба А. Мілінкевіча.

## КДБ атакуе сяброў дэлегацыі Аляксандра Мілінкевіча

**Супрацоўнікі ўпраўленьня КДБ Гарадзенскай вобласьці адабралі пашпарт у Анжалікі Борыс, старшыні непрызнаванага беларускімі ўладамі Саюзу палякаў у Беларусі. Паводле лідэра аб’яднаных дэмакратычных сілаў Аляксандра Мілінкевіча, згаданы факт не выпадковы, але зьвязаны з плянаваным візытам старшыні СПБ у Страсбург.**

Анжэліка Борыс уваходзіць у склад дэлегацыі, якая 11 сьнежня, разам з Аляксандрам Мілінкевічам, выляціць у

Страсбург, дзе лідэр аб'яднаных дэмакратычных сілаў мае атрымаць узнагароду Эўрапейскага парлямэнту імя Андрэя Сахарава за свабоду думкі – інфармуе прэс-служба Аляксандра Мілінкевіча.

„Безумоўна, забарона на выезд – гэта працяг той кампаніі, якую вядзе ўлада, каб максымальна аслабіць нашую дэлегацыю й перашкодзіць нам выступіць на сэсіі Эўрапейскага парлямэнту," – сказаў Аляксандар Мілінкевіч.
Нагадаем, Анжэліка Борыс была выкліканая ў КДБ у якасьці сьведкі па крымінальнай справе. 29 кастрычніка аўтамабіль, у якім ехала А. Борыс з калегамі, быў затрыманы на памежным пераходзе зь Летувой. Падчас агляду машыны мытнікі „выпадкова" раскруцілі люстэрка, у якім знайшлі парашок, які аказаўся наркотыкам.

Галоўная рада Саюзу палякаў у Беларусі назвала гэтае здарэньне правакацыяй.

## Беларуская апазыцыя прапаноўвае ўладзе абмеркаваць прапановы Эўрапейскага Зьвязу

**Анатоль Лябедзька накіраваў на імя прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага й кіраўніка адміністрацыі прэзыдэнта Генадзя Нявыгласа зварот з прапановай стварыць сумесную працоўную групу, каб абмеркаваць прапановы Эўразьвязу і магчымыя шляхі іх рэалізацыі.**

„Нацыянальны Камітэт аб'яднаных дэмакратычных сілаў ацэньвае, што прапановы Эўрапейскага Зьвязу зьяўляюцца важнай умовай для пачатку агульнанацыянальнага дыялёгу ў краіне," – заявіў кіраўнік Нацыянальнага Камітэту, лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька – інфармуе Хартыя  97.

Паводле А. Лябедзькі, пасланьне Эўрапейскага Зьвязу зьвернутае ня толькі да ўлады, але й да ўсіх грамадзян краіны. „Яно закранае практычна кожнага. Гэта значыць, трэба прымаць калектыўнае рашэньне. Манаполія альбо табу тут непрымальныя. Неабходная публічная агульнанацыянальная дыскусія на тэлебачаньні й у друкаваных выданьнях. Гэта сапраўды тая ледзьве прыкметная сьцяжынка, па якой можна пачаць рух у бок, процілеглы канфрантацыі, варожасьці й расколу," – лічыць лідэр АГП.

Нацыянальны Камітэт мае намер азнаёміць жыхароў Беларусі з прапановамі Эўразьвязу. „У людзей павінна быць права выбару. Не скажоная і поўная інфармацыя дапаможа зрабіць усьвядомлены выбар" – падкрэсьліў Анатоль Лябедзька.

# ЭКАНОМІКА

## Эўразьвяз адменіць гандлёвыя ільготы для Беларусі

**5 сьнежня працоўная група экспэртаў Эўразьвязу большасьцю галасоў вырашыла выключыць Беларусь зь ліку краін-карыстальнікаў Генэральнай сыстэмы прэфэрэнцыяў (ГСП) – паведамляе БелаПАН.**

„Дадзенае рашэньне павінны фармальна ўхваліць пастаянныя прадстаўнікі краінаў ЭЗ. Гэта адбудзецца да Калядных сьвятаў, хутчэй за ўсё, 20 сьнежня" – сказаў супрацоўнік прэс-службы ЭЗ.

Сярод краінаў, якія прагаласавалі супраць выключэньня Беларусі з ГСП, былі Грэцыя, Кіпр і Латвія. Чэхія й Славаччына ўстрымаліся ад галасаваньня. У выпадку ўхвалы пастаяннымі прадстаўнікамі краінаў ЭЗ дадзенае рашэньне ўступіць у сілу праз паўгода.

Нагадаем, што працэдура прыпыненьня гандлёвых прэфэрэнцыяў для Беларусі была ініцыяваная Радай Эўразьвязу у жніўні 2005 года ў сувязі зь інфармацыяй аб парушэньні ў Беларусі правоў прафсаюзаў. Калі дзеяньне прэфэрэнцыяў будзе прыпыненае, то пры тавараабароце з Эўразьвязам у 3 млрд. эўра (у 2005 годзе) Беларусь можа штогод губляць да 300 млн. эўра.

Генэральная сыстэма прэфэрэнцыяў – гэта сыстэма мытных ільгот, якія прадстаўляюцца краінам, што разьвіваюцца, з боку разьвітых дзяржаваў. Пад краінамі, якія разьвіваюцца, разумеюцца 77 краінаў па клясыфікацыі ААН, краіны былога СССР, дзяржавы былога сацыялістычнага блёку, якія пакуль не ўступілі ў ЭЗ, а таксама Кітай.

## Стабілізацыйны крэдыт ад Расеі

**Беларусь разглядае магчымасьць узяць ад Расеі гэтак званы стабілізацыйны крэдыт.**

Крэдыт прызначаўся б на кампэнсацыю стратаў у выніку пагаршэньня зьнешнепалітычных умоваў – паведаміў намесьнік старшыні ўправы Нацыянальнага банку Беларусі Мікалай Лузгін – паведамляе інфармацыйнае агенцтва Белта.

Паводле яго слоў, Беларусь брала ў Расеі аналягічныя крэдыты. „Гэта нармальная практыка," – лічыць М. Лузгін.

Прадстаўнік Нацбанку заўважыў таксама, што стабілізацыйны крэдыт можа прыдацца Беларусі ў выпадку пераходу краіны на расейскі рубель. Пакуль пытаньне крэдыту яшчэ не разглядаецца Нацбанкам Беларусі й Банкам Расеі, але ў цэлым „расейскі бок гатовы разглядаць гэты варыянт" – сказаў старшыня ўправы Нацыянальнага банку Беларусі Мікалай Лузгін.

## Цана „Белтрансгазу" – 3,5 млрд даляраў

**Цана „Белтрансгазу" складае 3,5 млрд даляраў – лічыць галяндзкі банк ABN Amro. Тым часам, паводле інфармацыі інтэрнэтнага выданьня „Наша Ніва", у беларускім урадзе мяркуюць, што "Белтрансгаз" удасца прадаць па больш высокім кошце.**

"Мяркую, што цана „Белтрансгазу" будзе большай, чым 3,5 млрд Даляраў" – заявіў намесьнік міністра эканомікі Алег Мельнікаў, дадаўшы, што экспэрт рабіў ацэнку паводле некалькіх сцэнароў, што прывяло да наяўнасьці так званай „вілкі» ў канкрэтных лічбах".

Пры гэтым прадстаўнік міністэрства эканомікі адмовіўся назваць падрабязнасьці, што тычацца ацэнкі банкам ABN Amro "Белтрансгазу", дадаўшы, што бакі падпісалі пагадненьне аб канфідэнцыйнасьці.

Намесьнік міністра эканомікі паведаміў, што стварэньне сумеснага прадпрыемства на базе "Белтрансгазу" будзе наўпрост уплываць на цану расейскага газу, які Беларусь будзе атрымліваць у наступным годзе.

Між тым, як паведамляе ўпраўленьне інфармацыі канцэрну "Газпром", 30 лістапада ў цэнтральным офісе ААТ "Газпром" адбылася рабочая сустрэча старшыні праўленьня газавай манаполіі Аляксея Мільлера й першага віцэ-прэм'ера Беларусі Ўладзімера Сямашкі. Бакі абмеркавалі вынікі незалежнай ацэнкі "Белтрансгазу" і ўмовы паставак расейскага газу ў Беларусь у 2007 г.

У прэс-рэлізе канцэрну "Газпром" таксама адзначаецца, што кампанія перайшла на рынкавыя прынцыпы супрацоўніцтва з усімі краінамі-пакупнікамі расейскага газу, апрача Беларусі".

„Беларусь ёсьць апошняй дзяржавай, што захавала нізкія цэны закупкі расейскага газу ў 2006 г., што зьвязана з прыняцьцём Беларусьсю шэрагу рашэньняў, што адпавядаюць эканамічным інтарэсам канцэрну „Газпром" – адзначаецца ў прэс-рэлізе.

# ГРАМАДЗТВА

## Новыя польскія візы для беларусаў

**Польская Амбасада ў Беларусі ўвяла новую форму віз для беларускіх грамадзян, якія хочуць хутка ўехаць на тэрыторыю Польшчы ды ня маюць часу на афармленьне дакумэнтаў. Экспрэс-візу, якая каштуе 38 даляраў, можна атрымаць цягам некалькіх гадзінаў.**

Цяпер за аднаразовую ўязную візу ў Польшчу трэба заплаціць 6 даляраў, а за шматразовую – 30 даляраў. Пасьля далучэньня Польшчы да Шэнгенскай зоны, што павінна адбыцца, прыблізна на пачатку 2008 года, Польшча павысіць цэны сваіх віз да 60 эўра. Тым ня менш палякі гатовыя задумацца над магчымасьцю паніжэньня кошту віз для паасобных катэгорыяў беларускіх грамадзян.

Кожны дзень Амбасада Польшчы ў Беларусі выдае да 500 віз у дзень. Ад пачатку 2006 года колькасьць польскіх віз, выдадзеных беларускім грамадзянам, склала каля 100 тысяч – інфармуе Белта.

## Міжнародная Хэльсынская Фэдэрацыя заклікае дапамагчы беларускім праваабаронцам

**Міжнародная Хэльсынская Фэдэрацыя асудзіла канфіскацыю маёмасьці ў Беларускім Хэльсынскім камітэце й заклікала Эўразьвяз і ўсіх сяброў АБСЭ выказаць салідарнасьць з беларускімі праваабаронцамі – чытаем на сайце праваабарончай арганізацыі „Вясна”.**

„Беларускаму Хэльсынскаму камітэту, як і беларускаму народу ў цэлым, патрэбная салідарнасьць міжнароднай супольнасьці. Пры адсутнасьці праваабарончых груп урад можа ўзмацняць сваю ўладу абсалютна, без кантролю грамадзтва й без усякай адказнасьці” – заявіў выканаўчы дырэктар Міжнароднай Хэльсынскай Фэдэрацыі па правах чалавека Аарон Роўдс.

Нагадаем, што 5 сьнежня судовыя выканаўцы канфіскавалі маёмасьць рэспубліканскага грамадзкага аб’яднаньня „Беларускі Хэльсынскі камітэт” (БХК) – кампутар, факсымільны апарат і іншае. Маёмасьць была апісаная ў выніку рашэньня Вышэйшага Гаспадарчага суду (ВГС) па справе падаткаабкладаньня сродкаў, якія былі атрыманыя ў рамках праграмы TASIS.

Пастанова прэзыдыюма ВГС супярэчыць іншаму працэсуальнаму дакумэнту – рашэньню сьледчага Дэпартамэнту фінансавых расьследаваньняў Камітэту дзяржаўнага кантролю аб спыненьні крымінальнай справы, які пацьвярджае, што службовыя асобы БХК не павінны выплачваць падаткі па спрэчных грашовых сумах.

## Каталікі перамаглі чыноўнікаў

**6 дзён галадоўкі 16-ці жанчын і пробашча парафіі айца Аляксандра Шэмета прымусілі мясцовыя ўлады зрабіць тое, на што ім не хапіла 10 гадоў. Старшыня Гарадзенскага аблвыканкаму Уладзімер Саўчанка даў дазвол на пабудову касьцёлу на вул. Рэпіна.**

На шосты дзень галадоўкі гарадзенскія каталікі спынілі акцыю пратэсту. Абласныя ўлады перадалі біскупу Аляксандру Кашкевічу заяву, у якой гаворыцца, што аблвыканкам ня супраць пабудовы сьвятыні на месцы цяперашняй капліцы парафіі Найсьвяцейшай Панны Марыі Вастрабрамскай, Маці Міласэрнасьці. Вернікі парафіі часова прыпынілі галадоўку.

Тым ня менш, паводле пробашча парафіі айца Аляксандра Шэмета, цешыцца трэба толькі на 20%. „Гэта вельмі хітры ліст, які сьведчыць пра тое, што перад намі яшчэ даволі шмат працы. У дакумэнце яны запісалі, што ня супраць будаўніцтва касьцёлу, але ж яны заўсёды казалі, што ня супраць. Складваецца ўражаньне, што 10 гадоў я змагаюся сам з сабою, пішу лісты, бегаю па розных установах”.

Айцец Шэмет кажа, што як толькі справа зацягнецца ізноў, то вернікі адновяць галадоўку. „З камуністамі нельга весьці дыялёг, бо нас гэта ўжо давяло да руінаў. Яны ж зьнішчылі Горадню, паразбуралі тое, што было самае прыгожае ў нашым горадзе.(...) Сёньня шосты дзень, але калі трэба, то будзе й 365 дзень,” – перасьцярог пробашч парафіі Найсьвяцейшай Панны Марыі Вастрабрамскай, Маці Міласэрнасьці айцец Аляксандар Шэмет.

# КУЛЬТУРА

## Чарнобыль пачынаецца ў Познані

**У Познані адбылася прэм’ера спэктакля беларускіх, украінскіх ды польскіх рэжысэраў „Чарнобыль. ТМ”. Гэта першы такога кшталту маштабны тэатральны праект у рамках супрацоўніцтва паміж трыма краінамі.**

Каардынатарамі праекту зьяўляюцца польскі актор Яраслаў Сейкоўскі, украінскі рэжысэр Сьвятлана Алешка, а зь беларускага боку студэнт тэатральнай ВНУ ў Кракаве Зьміцер Чарткоў.

Праект, падтрыманы Міністэрствам культуры Польшчы, Эўрапейскім культурным фондам і Польскім інстытутам у Менску, пасьпяхова стартаваў на мінулым тыдні на польскай сцэне. І ўжо 9 сьнежня творчы калектыў плянуе выступіць са спэктаклем перад менскімі гледачамі.

Паводле Яраслава Сейкоўскага, ідэя стварэньня спэктакля пра Чарнобыль узьнікла пасьля прачытаньня кнігі „Чарнобыльская малітва” беларускай пісьменьніцы Сьвятланы Алексіевіч.

Пасьля кнігі былі працяглыя паездкі па забруджанай радыяцыяй зоне – знаёмствы з тамтэйшымі жыхарамі, ліквідатарамі наступстваў чарнобыльскай катастрофы, эколягамі, чыноўнікамі. Так пакрысе зьбіраўся матэрыял для сцэнару. Да гэтага дадаліся таксама дакумэнтальныя творы. Так паўстаў спэктакль „Чарнобыль. Гандлёвы знак”.

У хуткім часе „Чарнобыль.TM” будзе паказаны ў Менску й Гомелі, а неўзабаве й ва Украіне – чытаем на сайце выданьня „Наша Ніва”.

## „Наша Ніва” ў Магілёве й Бялынічах

**Рэдакцыя „Нашай Нівы” працягвае ладзіць мерапрыемствы, прысьвечаныя стогадоваму юбілею газэты. У Магілёве й Бялынічах адбыліся сьвяточныя вечарыны з удзелам супрацоўнікаў выданьня – паведамляе карэспандэнт Беларускай службы Радыё Палёнія.**

Зь Менску на сустрэчу з магілёўскімі чытачамі прыехалі былы галоўны рэдактар „Нашай Нівы” Андрэй Дынько, Алесь Кудрыцкі, паэт Андрэй Хадановіч ды гарадзенскі крытык Даніла Жукоўскі. Перад гэтым яны наведалі Бялынічы.

Удзельнікі імпрэзы ў Магілёве казалі пра зьмены ў Беларусі й газэце за апошнія 15 гадоў. Як зазначыў Андрэй Дынько, сёньняшняя сытуацыя радыкальна адрозьніваецца ад той, што была ў часы БССР. Зараз адбываецца дэсаветызацыя, цэнтар беларускага жыцьця расьцярушваецца па ўсёй краіне. Перамены ж прыйдуць толькі тады, калі мы будзем працаваць месяцамі, гадамі, падкрэсьліў ён.

Чытачом „Нашай Нівы”, пераважна моладзі, быў прадстаўлены фільм пра сёньняшнюю рэдакцыю газэты й яе супрацоўнікаў. Магілёўцы ўбачылі, хто й у якіх умовах стварае выданьне.

Прыкладна праз год рэдакцыя плянуе разьмяшчаць на сваім сайце таксама й відэаматэрыялы. Пра гэта паведаміў Андрэй Дынько, які пасьля сыходу з пасады галоўнага рэдактара, пачаў займацца рэдагаваньнем інтэрнэт-старонкі „Нашай Нівы”.

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фарма-ваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, нямецкай, французскай, польскай, беларускай, расейскай ды ўкраінскай мовах можна замовіць на сайце.